ГАЗЕТА З БЕЛАРУСІ

# ГОЛАС РАДЗІМЫ

ВЫДАЕЦЦА З 1955 ГОДА ● ● NO. 16 (3520) ● ● ЧАЦВЕР, 20 КРАСАВІКА, 2017

ШТОТЫДНЁВІК "ГОЛАС РАДЗІМЫ" МОЖНА ЧЫТАЦЬ У ІНТЭРНЭЦЕ: WWW.GOLAS.BY



**Дзякуй ад усяго сэрца**

У рэдакцыю прыйшло пісьмо ад беларусаў Кыргызстана, і ў ім нашы супляменнікі выказваюць шчырую падзяку Амбасадару Беларусі ў Бішкеку Віктару Дзянісенку за падтрымку і ўзаемаразуменне Стар. 2



**Духоўных шляхоў яднанне** Стар. 3



**Пісанка — сімвал Вялікадня** Стар. 4




У такім маладым, прыгожым складзе выйшаў на сцэну абараняць званне "народны" беларускі калектыў "Купалінка"

# Новая вышыня "Купалінкі"

## Вядомы беларускі творчы калектыў з Тальяці, якім кіруе ўраджэнка Бабруйска Людміла Дзёміна, абараніў ганаровае званне "народны" пад час канцэртнай праграмы "Напеў зямлі маёй Беларусі"

**Іван Ждановіч**

Людміла Дзёміна з яе творчай, і ў той жа час моцнай, валявой натурай — гэта своеасаблівая сарцавіна ўсёй дзейнасці беларускай суполкі "Нёман" з Тальяці. Зрэшты, чытачы "Голасу Радзімы" ведаюць, колькі цікавых спраў на рахунку супляменнікаў з Аўтаграда. Мы пісалі, напрыклад, не толькі пра шматлікія выступленні гуртоў "Купалінка" ды "Зярняткі" ў Тальяці, пра сумесны канцэрт іх з беларусамі з Барнаула, але і пра цікавыя кантакты з землякамі з Ваўкавыска і раёна (Гродзеншчына). У нататках "Ад Волгі да Брэста" (ГР, 28.05.2015) Людміла Іванаўна дзялілася ўражаннямі ад аўтапрабегу "Сцяг Перамогі", які прайшоў дарогамі воінскай славы, па месцах знакавых падзей ваеннага часу, мемарыялах на тэрыторыі Расіі ды Беларусі. Там гаворыцца, што яе дзед "пайшоў на фронт 23 чэрвеня і прапаў без вестак на пачатку вайны. Бабуля, мама і яе сястра цудам выжылі ў акупаваным Бабруйску". Прычым, помніцца, рыхтуючы тэкст да друку, мы з зямлячкай знайшлі нават імя яе дзеда ў спісах прапалых без вестак байцоў на вядомым сайце obd-memorial.ru

### Калі суполка — як сям'я

Мне імпануе ў натуры Людмілы Іванаўны яе жыццядольнасць, і што актыўна далучае яна да беларускіх спраў і сына, і ўнукаў, і нават нявестку. І што, нягледзячы на розныя жыццёвыя абставіны, змагла-такі ўтрымаць сваю родную "Купалінку", абнавіць, надаць ёй другое дыханне. Што ёсць у беларусаў Тальяці павага да роднай мовы, беларускіх традыцый — хоць розныя меркаванні на гэты конт, часам дзеліцца, даводзіцца ёй чуць. У тым ліку, на жаль, і ад супляменнікаў, якім, як ні дзіўна, чамусьці прыклад выжывання беларускай суполкі ў крызісным Аўтаградзе, змаганне "Нёмана" за месца пад сонцам падаецца нейкай гульнёю ды "пацешкамі".

Што ж, у кожнага — свой шлях да Беларусі. Ведаючы, што Людміла Іванаўна мужна трымае ўдар, усё ж хочацца нагадаць усім беларусам, што не ўмеюць жыць у згодзе, пра павучальны досвед з гісторыі. Варта б паглядзець у інтэрнэце, пачытаць, праз сэрца прапусціць, што такое тры падзелы Рэчы Паспалітай — і перастаць сварыцца… А заадно павіншаваць адзін аднаго з Уваскрасеннем Хрыстовым, узгадаць яго запавет усім нам: "Любіце адзін аднаго!".

### Творчая перамога

А цяпер — пра "Купалінку". Людміла Дзёміна, яе стваральніца і нязменны мастацкі кіраўнік, сама спявачка, піша нам: "Больш за 12 гадоў раде сваёй творчасцю жыхароў горада і вобласці ансамбль беларускай песні "Купалінка". Гэта, нагадаю, гурт нашай Мясцовай грамадскай арганізацыі "Беларуская нацыянальна-культурная аўтаномія "Нёман" гарадской акругі Тальяці". Калектыў вядомы як у Тальяці, так і ў нашай Самарскай вобласці, і ў Маскве, ведаюць яго і ў Беларусі. Сёлета ў ягоным жыцці — важны этап. 30 сакавіка 2017 года ў плыні канцэртнай праграмы "Напеў зямлі маёй Беларусі", які праходзіў у нашым горадзе ў Палацы культуры, мастацтва і творчасці, "Купалінка" абараняла высокае званне: народны самадзейны калектыў".

У зале, дарэчы, было больш за 1200 гледачоў. Прыехала і салідная камісія з Самары, якую ўзначальвала прафесар кафедры харавога мастацтва Самарскага інстытута культуры, заслужаны дзеяч мастацтва Расіі Людміла Цырэнцьева. У складзе камісіі былі выкладчыца Самарскага абласнога вучылішча культуры і мастацтваў, кіраўніца ансамбля народнай песні "Чебатуха" Алена Гусева ды загадчыца аддзела традыцыйнай культуры, даследаванняў ды інфармацыі Агенцтва сацыякультурных тэхналогій Мінкультуры Самарскай вобласці Ірына Ермакова.

Людміла Дзёміна спачатку напісала нам, што "канцэртная праграма выступлення членам камісіі спадабалася, але былі зроблены заўвагі, прапановы. У тым ліку і наконт таго, што касцюмы ў артыстаў павінны быць народныя, а не сцэнічныя, стылізаваныя". І што, няўжо з-за гэтага не прайшлі — пытаем. Піша: "Рашэнне камісіі з запісам у пратаколе: прысвоіць званне "Народны". Віншуем! Вельмі рады! Гэта, лічым, перамога ўсё беларускай культуры ў Паволжы. → Стар. 3

**ПОВЯЗЬ ЧАСОЎ**

# Друкаваны абярэг Бацькаўшчыны



Кніга з друкарні Францыска Скарыны

**Іван Іванаў**

**Падзвіжніцкая праца Францыска Скарыны стала важным элементам у падмурку беларускай дзяржаўнасці**

Сярод многіх жыццёвых шляхоў, што адкрываліся адукаванаму ды ўганараванаму званнем доктара навук у вядомым Падуанскім універсітэце Францыску Скарыну, выбраў ён цярністы шлях асветніцтва. Зрэшты, у вызначэнні асветнік-гуманіст, як пішуць пра вялікага палачаніна энцыклапедыі сёння, мы бачым плён ягонага жыцця з пазіцый нашага часу. А былі ж і гады, калі, з пазіцый атэістычных, некаторыя тагачасныя даследчыкі называлі перакладчыка Біблії "рэлігійным цемрашалам"... Цікава, што цяпер сярод характарыстык беларускага і ўсходнеславянскага першадрукара, вучонага-медыка мы знаходзім яшчэ, што ён — і пісьменнік, грамадскі дзеяч, прадпрымальнік. Апошняе слова асабліва прыцягвае ўвагу. Што за бізнэс, здзівіцца нехта, мог быць у Скарыны?

Па сёння друкарская справа — прыбытковая, калі ўсё з розумам весці. Перадавая па тым часе, у якім жыў наш зямляк, тэхналогія кнігадрукавання рабіла сапраўдную рэвалюцыю ў жыцці грамадства. Бадай што як цяпер — інтэрнэт, лічбавыя тэхналогіі. Станавілася магчымым кнігі друкаваць — сотнямі, тысячамі экзэмпляраў, а не гадамі перапісваць іх уручную. Не выключаюць даследчыкі, што Скарына, як сын полацкага купца, разлічваў на прыбытак, арандуючы ў Празе друкарню. У інтэрнэце чытаем: "З архіўных крыніц вядома, што купец Лука Скарына меў у Полацку ўласную зямлю і гандлёвую справу, якая перайшла ў спадчыну старэйшаму сыну Івану. У яго камерцыйных аперацыях удзельнічаў і малодшы Францыск, што дазваляла яму вучыцца за мяжой і, мабыць, пазней часткова фінансаваць свае пражскае і віленскае кнігавыдаўніцтва".

→ Стар. 4

ЛІСТ У РЭДАКЦЫЮ

# Дзякуй ад усяго сэрца

## У рэдакцыю прыйшло пісьмо ад беларусаў Кыргызстана, і ў ім нашы супляменнікі выказваюць шчырую падзяку Амбасадару Беларусі ў Бішкеку Віктару Дзенісенку за падтрымку і ўзаемаразуменне

"Сем гадоў Віктар Дзенісенка знаходзіўся ў Кыргызстане ў якасці Амбасадара Беларусі, заўсёды быў адкрыты для сустрэч, спагадлівы да нас, беларусаў. Зрэшты, як і да ўсіх, хто прыходзіў у Амбасаду з сваімі праблемамі, прапанаванмі аб супрацоўніцтве. На наш погляд, ён бездакорна выконваў высокую місію Надзвычайнага і Паўнамоцнага Амбасадара Беларусі ў Кыргызстане, дбаў пра ўмацаванне братэрскай дружбы паміж народамі нашых краін.

Як вядома, апошнія гады былі вельмі няпростыя для ўсіх нас, хто жыве ў Кыргызстане. Бывала, і двухбаковыя адносіны паміж нашымі краінамі абвастраліся. Асабліва цяжка было ў 2010-м, калі ў Беларусь з'ехаў былы прэзідэнт Кыргызстана Курманбек Бакіеў. Да беларускай Амбасады ў Бішкеку ішлі дэманстранты з плакатамі, патрабавалі тлумачэнняў. І Віктар Аляксандравіч выходзіў да іх, выслухоўваў, запрашаў актывістаў у залу перамоў. Такая праца па ўрэгуляванні канфліктных пытанняў, усталяванні паразумення — надзвычай важная. Амбасадар Беларусі ў Кыргызстане рабіў усё магчымае, каб сувязі паміж нашымі народамі не пагоршыліся, а ўзаемна ўмацоўваліся, каб краіны збліжаліся і супрацоўнічалі. Беларусь і Кыргызстан звязаны ж і гістарычна: разам нашы бацькі, дзяды змагаліся супраць фашызму ў гады Другой сусветнай...

За час працы Віктара Дзенісенкі ў Кыргызстане значна палепшыліся паказчыкі ўзаемнага тавараабароту, памацнелі гандлёва-эканамічныя стасункі. Пашырылася і гуманітарная дапамога з боку Беларусі. Дарэчы, многія дабрачынныя праекты ажыццяўляліся праз беларускае аб'яднанне "Світанак". Так, на працягу сямі апошніх гадоў мы рэгулярна атрымлівалі беларускія прадукты і раздавалі іх людзям, якія жывуць у нястачы. Колькі добрых слоў было сказана ў адрас Беларусі ад кыргызаў!



ПРЭС-СЛУЖБА ПРЭЗІДЭНТА КЫРГЫЗСКАЙ РЭСПУБЛІКІ

Прэзідэнт Кыргызстана А. Атамбаеў і В. Дзенісенка

Менавіта пры Віктары Дзенісенку было ўзята шэфства над сярэдняй школай у сяле Атуз-Уул (Ак-Суйскі раён у Ісык-Кульскай вобласці), якая носіць імя Жумаша Асаналіева, Героя Савецкага Саюза. Ён, кулямётчык, быў у ліку тых, хто вызваляў Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. (Загінуў 25 чэрвеня 1944 года ў Бешанковіцкім раёне Віцебскай вобласці. — **Рэд.**). Сельскай школе аказваецца матэрыяльная дапамога, а музей, прысвечаны жыццю Героя-кыргыза, папоўніўся новымі экспанатамі. Дарэчы, беларусы таксама шануюць памяць Жумаша Асаналіева: у Мінску яму ўзведзены помнік, адна з вуліц носіць яго імя, усталяваны абеліск Герою і ў вёсцы Узрэчча, дзе ён пахаваны.

Нядаўна стала вядома: Віктар Аляксандравіч Дзенісенка заканчвае працу Амбасадара ў Кыргызстане. І наша падзячнае пісьмо яму, нібы суправаджальнае, — у дарогу на Бацькаўшчыну. Упэўнены, што ён і далей годна прадоўжыць адказную працу дыпламата, якая цалкам адпавядае радкам з верша старажытнага сярэднеазіяцкага паэта Юсуфа Баласагуні. Па-руску яны гучаць так: "Быть мудрым, степенным послу надлежит,/ Он должен быть в мудрости слов даровит./ Посол должен предан быть, сердцем широк/ В делах безупречен и в честности строг./ И надо быть ладным с лица и на вид:/ Послу отличаться от всех надлежит".

Сапраўды, Віктар Дзенісенка, на наш погляд, усім гэтым патрабаванням адпавядае. Мы шчаслівыя, што былі побач з такім незвычайным чалавекам, сапраўдным Грамадзянінам Беларусі.

Ад усіх беларусаў Кыргызстана Віктару Аляксандравічу: вялікі дзякуй! Жадаем дарагому нам чалавеку новых і добрых спраў на абраным ім няпростым шляху".

**Аляксандр Шут,** старшыня Згуртавання беларусаў у Кыргызстане "Світанак", кавалер медаля "Данк"

ВЕСТКІ

## Вялікая сіла космасу

**Святочная вечарына "Беларускім героям космасу прысвячаецца" прайшла 13 красавіка ў Дзелавым і культурным комплексе Пасольства Беларусі ў Расіі**

На сайце Пасольства з'явіўся фотарэпартаж з падзеі. Як вядома, Беларусь толькі нядаўна ўвайшла ў клуб касмічных дзяржаў, аднак нашыя супляменнікі, можна сказаць, сотні гадоў "працуюць на космас". Што, напрыклад, вам кажа імя Казіміра Семяновіча, які нарадзіўся каля 1600 і памёр каля 1651 года? Між тым у інтэрнэце ёсць весткі пра яго, ваеннага інжынера з арміі Вялікага Княства Літоўскага, тэарэтыка артылерыі. Некаторыя лічаць: гэта ён быў вынаходнікам прататыпа шматступеннай ракеты. Як доказ — шматлікія малюнкі вынаходства ў яго ягонай кнізе "Вялікае майстэрства артылерыі".

На вечарыне ў Пасольстве сабраліся вядомыя людзі. "Дзень касманаўтыкі для беларусаў і расіян — гэта не толькі нагода ўспомніць вялікія вехі агульнай гісторыі, адчуць гонар за выдатныя дасягненні... Гэта і нагода зазірнуць у будучыню. Таму што будучыня чалавецтва звязана з касмічнымі тэхналогіямі", — казаў, адкрываючы свята, Часовы Паверанны ў справах Беларусі ў Расіі Павел Лёгкі. Дыпламат нагадаў, што Беларусь хоць і невялікая дзяржава, але ў яе ёсць свая касмічная гісторыя. Бо, як вядома, сцежку ў космас пратапталі тры ўраджэнцы Беларусі: Уладзімір Кавалёнак, Пётр Клімук і Алег Навіцкі.

Па словах Паўла Лёгкага, станаўленне касмічнай сферы ў Беларусі праходзіла няпроста. Калі ў свой час Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка падаў ідэю стварыць уласную касмічную галіну, то было і нямала скептыкаў. Але ж, адзначыў Павел Лёгкі, такое смелае рашэнне было правільным, і сёння Беларусь актыўна працуе над стварэннем новых касмічных тэхналогій: "Гэта не проста імідж краіны — гэта і наша эканоміка".

Між тым асваенне космасу мае і магутны, ужыў прыгожае слова дыпламат, духапад'ёмны эфект. "Космас — гэта таксама наша духоўная скрэпа", — падкрэсліў ён. Пры тым заўважыў: космас нясе і вялікі патэнцыял, які аб'ядноўвае народы. Так, у плыні Саюзнай дзяржавы рэалізаваны тры беларуска-расійскія касмічныя праграмы, яшчэ дзве — у стадыі распрацоўкі. І гэта, лічыць Павел Лёгкі, яскравае сведчанне таго, як можна і трэба працаваць сумесна.

На вечарыне выступалі Дзяржсакратар Саюзнай дзяржавы Рыгор Рапота, кіраўнік апарата НАН Беларусі Пётр Віцязь. Да прысутных з борта Міжнароднай касмічнай станцыі звярнуўся касманаўт, Герой Расіі, ураджэнец Беларусі Алег Навіцкі. Ён выказаў словы падзякі старэйшым таварышам, што былі на вечарыне і сталі касмічнымі першапраходцамі: "З велізарным задавальненнем хачу перадаць прывітанне роднай Беларусі, землякам, чыя нябачная падтрымка надае мне вялікую сілу". Ураджэнец Беларусі, генерал-палкоўнік, двойчы Герой Савецкага Саюза, лаўрэат Дзяржпрэміі СССР Пётр Клімук падзяліўся яркімі ўспамінамі аб трох палётах у космас, распавёў пра атмасферу ўзаемадапамогі, падтрымкі, якая заўсёды пануе на борце станцыі.

ТРАДЫЦЫІ

# Вясну-красну ў Зауралле запрашалі

**Беларускі народны абрад Гуканне Вясны правялі ў Курганскім абласным мастацкім музеі Расіі**

Каб хутчэй прыходзіла вясна ў Зауралле, мясцовыя беларусы вырашылі яе пагукаць. Праўда, на Беларусі гэта робяць на прыродзе — на ўзвышшах, пагорках, бліжэй да Сонца, прычым выбіраюць мясціны з вясновымі пралалінамі. А вось у Кургане свята адзначалі ў памяшканні: толькі асвойваюць яго сімволіку, духоўныя сэнсы актывісты Курганскага цэнтра беларускай культуры "Бацькаўшчына".

На другім паверсе музея 7 красавіка, на Дабравешчанне, была разгорнута выстава "Славянскі свет". Там і сабраліся тыя, хто паважае традыцыі продкаў. Былі запрошаны і пяцікласнікі з 32-й школы Кургана. Вядучая Святлана Кулакова распавяла пра старажытны беларускі абрад Гуканне Вясны, прычым яе аповед ілюстраваўся фота- і відэасюжэтамі. Некалькі беларускіх народных песень-вяснянак выканалі ўдзельнікі беларускага ансамбля "Жураваачка".

Для юных наведнікаў музея ладзіліся беларуская народныя гульні. А найбольш ім спадабаўся майстар-клас па вырабе абрадавых сімвалаў: птушак з салёнага цеста. Дзяцей, як і павялося здаўна ў беларусаў, частавалі таксама адметнымі прысмакамі — печывам у выглядзе птушачак.

**Таццяна Макавеева,**
г. Курган



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

Печыва ў выглядзе птушак — сімвал Гукання Вясны

**АД РЭДАКЦЫІ**

Калі тэкст рыхтаваўся да друку, кіраўніца Курганскага цэнтра беларускай культуры "Бацькаўшчына" Людміла Урванцава ўдакладніла: народныя беларускія святы нашы супляменнікі "праводзяць абавязкова". А вось наконт таго, каб рабіць гэта і з выездам, у сельскай мясцовасці, у вёсках, дзе кампактна жывуць суродзічы — пра тое беларусы Кургана "будуць думаць". Спадзяемся, і досвед правядзення абрадаў у натуральных асяродках, пра які мы пішам — спатрэбіцца. А ён, нагадаем, ёсць у суполак Іркуцка, сёлета на прыродзе справілі Гуканне Вясны і ў Малдове — гл. папярэдні нумар ГР.

Што да фалькларыстаў, то, напрыклад, Алесь Лозка ў сваім "Беларусім народным календары" (1993) піша: "Дзяўчаты выходзяць да гумнаў, залазяць на стрэхі ды, седзячы на іх, спяваюць цыкл вяснянак, у якіх кожны слупок заканчваецца выклічнікам "Гу!" Калі ж ідуць на вуліцу, з тымі ж песнямі водзяць "танкі" (гэта значыць: танчаць, танцуюць. — **Рэд.**) У Ельні Чэрыкаўскага павета сыходзяцца ля лазні, збіраюць мялля, г. зн. кастрыцу ад ільну і пяньkі, разводзяць агонь. Каля кастра і спяваюць вяснянкі. ("Так палююць мялля ўсякую вечарыну аж да Васкрэсных дзён".) У некаторых месцах з вёсак накіроўваюцца на бліжэйшы пагорак, там і "гукаюць Вясну". Нарэшце, дзе гэты звычай забываецца, дзяўчаты спяваюць вяснянкі проста ў сябе на прызбах. У апошні час у Гуканні Вясны больш удзел прымаюць і дзяўчынкі гадоў 12-14".

ТАЛЕНТЫ З ДЫЯСПАРЫ

# Новая вышыня “Купалінкі”

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)

### І прэстыж, і прызнанне

Што, аднак, будзе, акрамя гонару, мець ад гэтага беларуская суполка, яе кіраўніца? Можа, недзе ў горадзе нарэшце “Нёману” месца пад офіс знойдзецца? “Нічога гэтае званне калектыву ў сэнсе матэрыяльным не дае: ні стаўку, ні паўстаўкі, — дзеліцца Людміла Іванаўна. — Я ж працую на 0,5 стаўкі, гэта чыстымі 3500 руб у месяц расійскімі грашыма. Так што званне народны — гэта наш прэстыж. І прыемна мне ўсведамляць: ты прызнаны народам і спецыялістамі. Можа хіба што часцей запрашаць на гастролі будуць...”

А й сапраўды так сталася! Гэта я наконт запрашэнняў: бо ўжо на 9 красавіка запрасілі “Купалінку” выступіць у Самары. Хто канкрэтна? Браты-украінцы! Кіраўнік Украінскага нацыянальна-культурны цэнтра “Проминь” Іван Іванавіч Каплієнка. Ён праводзіў абласны Фестываль славянскіх народаў. Запрашала Дзёміну з “Купалінкай” на фестываль і асабіста дырэктар Дома дружбы народаў Самарскай вобласці Яўгенія Германаўна Харавіннікава. Для Дзёмінай, для яе маладых артыстаў гэта — вялікая радасць: “Маім дзяўчатам і юнакам падабаецца выступаць! Гэта ж магчымасці для творчага росту. Я лічу так: калі запрашаюць, то мы павінны, выбраўшы песенную долю, больш бываць на самых розных творчых пляцоўках. Бо наперадзе ў нас і паездка ў мой родны Бабруйск: на Міжнародны фестываль “Вянок дружбы-2017”.


ІВАН ШАМАНСКІ

Маладыя спявачкі “Купалінкі”


ІВАН ШАМАНСКІ

Людміла Дзёміна

### Таленавітая каманда

Як вядома, апошнім часам у складзе “Купалінкі” ёсць абнаўленні. Хто ў ім цяпер? Людміла Іванаўна расказала пра тых, “хто сваёй працай, жаданнем, упартасцю і талентам прывёў да мэты”: да абароны звання “Народны”. І аказалася: у яе гурце сабраліся цяпер таленавітыя маладыя людзі, якія займаюцца і ў спартсекцыях, і ў музычных школах. Першай называе салістку Алену Марозаву: вучаніца 8 класа, займаецца ў ансамблі 5 гадоў — ішла ў яго з гурта “Зорачкі”. Вызначае яе Дзёміна так: “Вельмі таленавітая і артыстычная. Ідэальны слых, голас — ад Бога! Яна і кандыдат у майстры спорту па ушу. На абарону звання прыйшла з чамаданам, і адразу пасля абароны паехала ў Маскву, на спаборніцтвы, дзе таксама выдатна выступіла. Дарэчы, голас Алены — вельмі прыгожы, народны — адзначылі й члены камісіі”. Другая ў “спісе Дзёмінай” — дзесяцікласніца Лера Танкова: “У ансамблі з 5 класа: у першым складзе “Зорачак” была. У яе прыгожы альт, вельмі артыстычная, займалася танцамі. Старанная”. Артыстычнаю, старанною і таленавітаю названа і Вольга Мачалава, салістка, якая ў ансамблі тры гады. А вось Даша Папова ў гурце нядаўна, яна вучаніца 8 класа: “Займаецца ў музычнай школе. Адказная, артыстычная. У нас яна раскрылася як выканаўца лірычных песень”. “Сама пяшчота” — гэта пра Кацю Калмагорцаву. Яна закончыла музычную школу, але да “Купалінкі” анідзе не спявала, нават у музычнай школе ў хоры: “Першым часам баялася мікрафона... Дарэчы, мы з першых дзён усіх вучым працаваць з мікрафонамі”. Толькі год у ансамблі спявае Ірына Сычова: “ У яе народны прыродны голас. Цяпер яна — студэнтка медыцынскага каледжа. Займаецца і ў музычнай школе па класе гітары”.

Добрыя словы напісала Людміла Дзёміна ў адрас маладога і вельмі прафесійнага хормайстра Інэсы Лопаравай: “Мы пазнаёміліся з ёй у Дзіцячай школе мастацтваў “Гармония”, дзе вучыцца мая ўнучка Марыя Шылкіна. Інэса Аляксандраўна — выкладчыца па хоры, выкладчыца ад Бога. У нас адразу зрабіла шматгалоссе. Працавалі напружана: за пяць месяцаў вывучылі з гуртом 24 песні! Дарэчы, у горадзе з восені ў нас нейкі вірус гуляе, то ўсе нашы “купалінцы” перахварэлі па 2-3 разы. Таблетак віп'ем — і на рэпетыцыю. А можа гэта спевы дапамагаюць у лячэнні? Інэса Аляксандраўна прывяла ў ансамбль сына з унікальным голасам: Арцёма Лопарава. Ён у восьмым класе, закончыў музычную школу. Спявае і ў хоры, з-за чаго часам бываюць накладкі ў выступленнях”.

З юнакоў, якіх бачым і ў нашай газеце, Людміла Дзёміна называе Максіма Ямшчыкова. Ён у ансамблі з восені 2016-га, дзевяцікласнік: “Вучыцца ў ДШМ “Гармония” па класе вакалу. Вельмі адказны юнак, з добрым слыхам і голасам”. А Дзмітрый Матросаў амаль што два гады ў “Купалінцы”: “Першы год ён праводзіў на рэпетыцыі Вольгу Мачалаву, потым і сам вырашыў спяваць. Старанны юнак”. Толькі з восені ў гурце Ваня Мартыненка, дзесяцікласнік, у яго бас з адметным тэмбрам: “Ваня ў нас, мяркую, гэта будучы матэматык або праграміст”. І, нарэшце, унук Людмілы Іванаўны Віталь Шылкін, які ўжо дзесяцікласнік, — гэта пастаянны фатограф і відэааператар. “Такія ў нас выдатныя хлопцы!” — падводзіць рысу Людміла Дзёміна.

### Усім сябрам на радасць

Пасля канцэрта “Напеў зямлі маёй Беларусі” ў “Купалінкі” праз два дні было яшчэ адно знакавае мерапрыемства — з новай канцэртнай праграмай да Дня яднання гурт выступаў у Палацы культуры, мастацтва і творчасці. “У нас з'явіліся новыя сябры і гледачы, — радуецца Людміла Іванаўна. — Шмат прыйшло настаўнікаў і сваякоў удзельнікаў нашых ансамбляў. Нас так цёпла віншавалі! А некаторыя так былі расчулены: не ведалі, казалі, што ў нас ёсць такі цудоўны ансамбль, і ў ім спяваюць іх вучні”.

І яшчэ кранальны момант у перапісцы з Людмілай Дзёмінай. Яна піша: “Пасля фінальнай песні на абароне звання да мяне выйшлі на сцэну ўдзельніцы першага складу — Ганна Кузьмінічна Машакова і Зінаіда Іванаўна Карнавух, а таксама кіраўнік Рускага культурнага цэнтра Уладзімір Уладзіміравіч Патакаў. Мы так радаваліся, што ў “Купалінкі” ёсць другое дыханне! За кулісы прыйшлі сябры з украінскага зямляцтва “Дніпро”, кіраўнік чувашскай аўтаноміі “Шанчак”. І ўвогуле: да ночы не змаўкаў тэлефон! Так хутка добрая вестка пайшла па свеце. А дэпутат тальяцінскай гарадской Думы фракцыі КПРФ нават прыехаў да мяне дадому: з букетам кветак! Павіншавалі кіраўнікі нямецкага культурнага цэнтра, казахскага, казакі... Я і цяпер яшчэ прымаю віншаванні”.

Што ж, добрая гэта справа: завяваць высокае званне! Цяпер можна сказаць, што беларуская культура ў Тальяці ды ва ўсім Прыволжскім рэгіёне мае своеасаблівы знак якасці. І гэта ўсім беларусам — гонар.

ПЛАНЕТА ЛЮДЗЕЙ

# Духоўных шляхоў яднанне

Кастусь Ладуцька

**У Алматы прайшла прэзентацыя кнігі пра тое, як успрымаецца, перакладаецца і чытаецца, асэнсоўваецца творчасць вялікага казахскага пісьменніка Абая Кунанбаева ў замежжы**

“Творчасць Абая Кунанбаева ў замежнай рэцэпцыі” — так называецца кніга, што прэзентавалася на круглым стале, прысвечаным беларуска-казахскім літаратурным сувязям. (Слова рэцэпцыя азначае: прыняцце, засваенне. — **Рэд.**). Удзел у гэтым свяце дружбы прынялі казахскія літаратуразнаўцы, прадстаўнікі беларускай дыяспары ў Казахстане і беларускія госці Міжнароднай кніжнай выставы “Па Вялікім Шаўковым шляху”, што праходзіла ў тыя дні ў Алматы.

“Мы прыехалі ў Алматы, каб распавесці сваім сябрам пра 500-годдзе беларускага кнігадрукавання, пра ролю і месца першадрукара Францыска Скарыны ў пашырэнні асветніцтва, кніжнай культуры на ўсходнеславянскіх землях, — расказала выканаўчы дырэктар Саюза выдаўцоў і распаўсюджвальнікаў друку з Мінска Кацярына Чарапок. — Сёлета ў Беларусі — год пад знакам асаблівай увагі да традыцый кнігадрукавання. І прыемна было бачыць: казахі падрыхтаваліся да сустрэчы з намі, паказалі, якую канструктыўную супольную працу вядуць пісьменнікі Казахстана і Беларусі, якія прыгожыя рысы мае літаратурнае сяброўства нашых краін”.




Што да кнігі пра Абая і асэнсаванне яго творчасці ў свеце, то беларускі раздзел у ёй прадстаўлены грунтоўна. З артыкулам “Абай Кунанбаеў і беларуская літаратура” выступае акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Уладзімір Гніламёдаў. Дарэчы, шмат гадоў назад Уладзімір Васільевіч выступаў па гэтай тэме на навуковай канферэнцыі — яшчэ ў Алма-Аце. Цікавым падаецца асабістае ў тэксце вучонага, літаратара: “Абай увайшоў у маю свядомасць разам з раманам Мухтара Аўэзава “Шлях Абая”. Добра помню глухія снежаньскія вечары ў роднай вёсцы, слабае святло газавай лямпы, якую я, вярнуўшыся са школы, падсоўваў бліжэй да кнігі, каб лепей разгледзець яе старонкі, шматколерны свет гэтага экзатычнага, як тады мне падавалася, твора, у якім ідзе яркі і выразны аповед пра казахскую зямлю, яе людзей і норавы і пра гэтага светлага і разумнага чалавека...”.


ІВАН ЖДАНОВІЧ

Беларуская паэтка з Алматы Л. Шашкова і М. Мятліцкі

У зборніку змешчаны і артыкулы Мікола Мятліцкага “Палюбіўшы паэта, палюбіш і яго народ” і “Светач народнага духа”. Таксама — невыпадковы зварот да творчасці класіка казахскай літаратуры. Лаўрэат Дзяржпрэміі Беларусі Мікола Мятліцкі пераклаў кнігу Абая “Стэпавы прастор” на беларускую мову. Выдадзены ў 2010 годзе, гэты зборнік займеў шырокі розгалас і ў Беларусі. Былі рэцэнзіі ў друку, гучалі цёплыя словы на прэзентацыі кнігі ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі.

У беларускім раздзеле зборніка “Творчасць Абая ў замежнай рэцэпцыі” ёсць і тэкст журналіста Алеся Карлюкевіча. Яго расповяды — пра пераклады класіка ў Беларусі,ягоныя кнігі ў бібліятэках нашай краіны.

ПОВЯЗЬ ЧАСОЎ

# Друкаваны абярэг Бацькаўшчыны

**(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)**

Тры гады (1517-1519) малады доктар навук напружана працаваў, выдаючы ў чэшскай Празе 22 кнігі Святога Пісання на старажытнай беларускай мове. Дарэчы, мова тая была — царкоўнаславянскаю, з вялікай колькасцю слоў беларускіх, а некаму яна цяпер падаецца рускаю... І яшчэ варта ўдакладніць: Францыск Скарына, грамадзянін ВКЛ, не змог-такі, кажучы сучаснай мовай, прасунуць свой інавацыйны прадукт на рынак Маскоўскай дзяржавы. У інтэрнэце знаходзім: "Гуманіста, прадстаўніка еўрапейскай культуры Францішка Скарыну ў Маскве абвінавацілі ў ерасі, спалілі яго кнігі, а сам ён вымушаны быў ратавацца ўцёкамі"... Канфлікт той быў, як бачна, не толькі эканамічным, але і светапоглядным. Пэўна ж, ідэі, якія ўкладваў у свае кнігі наш першадрукар, адвяргала, не прымала расійскае грамадства. Прынамсі, на тым узроўні, дзе прымаліся дзяржаўныя рашэнні. А можа яго адпрэчыў як канкурэнта "рукапісны бізнэс", які прадстаўлялі тагачасныя перапісчыкі разам з іншымі прадстаўнікамі царквы?

"Няўдачы загартоўваюць моцных. На жаль, з людзьмі даводзіцца весці гульню, у якой амаль не прымаецца ў разлік сапраўдны сэнс рэчаў. Выйгрыш або пройгрыш залежыць ад нейкіх чыста знешніх прычын. І падманлівая знешнасць пройгрышу звязвае цябе па руках і нагах". А вось яшчэ цытата: "Дзіўна бачыць, як бяруць верх выпадковыя абставіны, як праступае вонкі велізарная цёмная сіла, тая самая, што прыводзіць у замяшанне бязмежныя першабытныя лясы, тая самая, што расце, шырыцца, апантана б'е крыніцай усюды, дзе толькі ладзіцца вялікая справа ... Пад націскам тонкіх ліян бурацца гіганцкія храмы". Гэта з "Начнога палёту" Антуана дэ Сэнт-Экзюперы. Але як файна кладуцца такія развагі з XX стагоддзя да той сітуацыі, з якой сустрэўся ў Маскве наш першадрукар!

Між тым на дварэ была эпоха Асветніцтва, і адукаваны ў Еўропе Францыск Скарына, безумоўна, разумеў: веды — гэта святло, дабро, а невуцтва — цемра, зло, ліха. Такая сімволіка, дарэчы, яскрава прачытваецца і ў яго ным знакамітым гравіраваным партрэце з кнігі "Быццё" (Прага, 1519). Як быць? У тым жа "Начным палёце": "Калі ня вырываць з коранем зло, ні вырываць яго кожны раз, як з ім сутыкаешся, тады пад час палёту згасне святло. Ведаць прылады зла і не змагацца са злом — злачынства"... У творы французкага пісьменніка ёсць надзвычай сучасныя развагі пра любоў да людзей — а Скарына жыў у эпоху Гуманізму — і высокае змаганне "не з імі, а з тым злом, якое дзейнічае праз іх", ды пра тое, як усім нам навучыцца "пазбавіцца ад страху перад ноччу". Вось таму, нягледзячы на складаныя жыццёвыя абставіны, Францыск Скарына і прадоўжыў сваю асветніцкую працу. Дзякуючы ёй мы сёння можам сказаць: бачыце гэтыя кнігі Скарыны? Ім па 500 гадоў! Гэта своеасаблівы друкаваны шчыт, абярэг Бацькаўшчыны. І калі некаму хочацца сказаць, што беларусы — маладая нацыя, і калі некаму ў сучасным свеце захочацца нас "павучыць жыццю", то мы можам прапанаваць: а паспрабуйце "на зуб" вось гэты аргумент. Пагадзіцеся: маладая беларуская дзяржаўнасць з такімі магутнымі духоўнымі каранямі значна больш устойліва сябе пачувае.

Пра тое, якімі скарбамі валодаем, мы, беларусы, гатовы расказваць свету. Нядаўна стала вядома: сёлета ў верасні ў Мінску пройдзе Міжнародны кангрэс "500 гадоў беларускага кнігадрукавання". Запланаваны міжнародны выставачны праект "Францыск Скарына і яго эпоха", створаны будзе і дакументальны фільм, прысвечаны першадрукару, з перакладам на замежныя мовы. А пад эгідай ЮНЕСКА будзе рэалізаваны беларускі мастацка-адукацыйны праект "Спадчына Францыска Скарыны": з арт-пленэрамі ў Беларусі, Літве, Італіі, Польшчы, Францыі ды Чэхіі. Асаблівая ўвага — да тых мясцін, якія спалучаныя з жыццём і дзейнасцю першадрукара. У Беларусі дзейнічае аргкамітэт па святкаванні 500-годдзя беларускага кнігадрукавання, і ў плане з умоўнай назвай "Беларуская кніга 500" — каля 60 пунктаў.

Да тых вялікіх планаў сёння падключаюцца і рэгіёны Беларусі, а таксама й актывісты беларускіх суполак у замежжы — яны ўжо ўдзельнічаюць у правядзенні памятных мерапрыемстваў і выстаў.



**Дырэктары латвійскіх бібліятэк А. Вілкс і В. Коцэрэ, а таксама А. Суша і мастак В. Целеш**

У прыватнасці, у прэс-рэлізах, дасланых у рэдакцыю, намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Алесь Суша паведамляе пра цікавыя сустрэчы ў Рызе і Таліне (пра эстонскую імпрэзу мы раскажам у наступным нумары). 10 красавіка ў Латвійскай нацыянальнай бібліятэцы была ўрачыстасць з нагоды 25-годдзя з дня ўстанаўлення дыпадносін паміж Беларуссю і Латвіяй. Пад час яе спадар Алесь Суша перадаў калегам з Латвіі поўнае Факсімільнае ўзнаўленне кніжнай спадчыны Францыска Скарыны. На здымках бачым і актывістаў беларускай дыяспары ў суседняй краіне. "Да прысутных звярнуліся намеснік Міністра замежных спраў Беларусі Алег Краўчанка, дзяржсакратар латвійскага МЗС Андрэйс Пілдэговічс, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Беларусі ў Латвіі Марына Далгаполава, гендырэктар БелТА Дзмітры Жук, намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Алесь Суша, дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Латвіі Андрыс Вілкс", — гаворыцца ў прэс-рэлізе. Там жа прайшла прэзентацыя міжнароднага навуковага і выдавецкага праекта "Кніжная спадчына Францыска Скарыны", адкрыліся дзве падрыхтаваныя БелТА фотавыставы: пра Беларусь і гісторыю двухбаковых адносінаў нашай краіны з Латвіяй.

Дарэчы, гасцям урачыстасці паказалі арыгінал Статута Вялікага Княства Літоўскага 1588 года на старабеларускай мове, які захоўваецца ў Латвійскай нацыянальнай бібліятэцы. А між тым некаторыя навукоўцы схіляюцца да думкі: Францыск Скарына, жывучы ў Вільні, быў актыўна задзейнічаны ў праекце "Статут ВКЛ", але ж першы ягоны варыянт не быў у сілу розных абставінаў пры жыцці асветніка надрукаваны.

НАРОДНЫЯ ТРАДЫЦЫ

# Пісанка — сімвал Вялікадня

**У Свяце пісанкі ў чарнігаўскім Цэнтры народных рамёстваў для дзяцей і юнацтва паўдзельнічала таксама і мясцовае Беларускае нацыянальна-культурнае таварыства "Сябры"**

Каларытнаю выглядала ў той дзень напярэдадні Вялікадня выставачная зала чарнігаўскага абласнога Цэнтра народных рамёстваў для дзяцей і юнацтва. Ладзілася вялікая імпрэза "Вялікдзень-2017". На думку арганізатараў, Вялікдзень — свята народнае, і далучэнне да яго спрыяе нацыянальна-патрыятычнаму выхаванню дзяцей, моладзі. Таму і далучыцца да праекта запрасілі выхаванцаў студый Цэнтра рамёстваў дзе іх бацькоў: разам лягчэй перадаваць багаты народны досвед.

З радасцю адгукнуліся на прапанову і прадстаўнікі Беларускага нацыянальна-культурнага таварыства "Сябры": прыйшлі са сваімі дзецьмі, унукамі. У беларускіх сем'ях Чарнігава паважаюць традыцыі продкаў, жывуць і велікодныя звычаі, абрады. Як вядома, і ў Беларусі ёсць традыцыя і фарбаваць, і распісваць велікодныя яйкі — адзін з даўніх сімвалаў хрысціянскага свята. Прыйшлі й прадстаўнікі армянскай абшчыны вобласці, "Крымскай абшчыны": на аснове хрысціянскіх каштоўнасцяў яднаюцца людзі розных нацыянальнасцяў. Было цікава даведацца, што ў кожнага народа ёсць адметнасці ў традыцыях святкавання Вялікадня, у тым ліку і ў тэхніцы роспісу яек. Дарэчы, пісанка й была ў цэнтры ўвагі. Нават у розных рэгіёнах Украіны яйкі распісваюць па-рознаму. Пра тое расказвалі навуковы супрацоўнік Чарнігаўскага гістарычнага музея Наталля Тонка ды Ірына Стасюк. А майстрыха з сяла Брусілаў Наталля Дубіна каларытна дапаўняла іх аповед, паказвала, як усё робіцца.



ВІКТАР КОШМАЛ

**Дзеці ў Чарнігаве старанна пераймаюць мастацтва пісанкі**

Мы даведаліся, што роспіс пісанкі — гэта не проста выпадковая мастацкая фантазія: кожны малюнак на яйку набывае глыбокі сэнс. Напрыклад, з такой земляробчай прыладай як вілы нашы продкі звязвалі надзеі на ўраджай. А шляхам пэўных рытуальных дзеянняў з "пісанкай" выклікалі дождж. Дарэчы, магічныя магчымасці украінскай пісанкі выпрабаваў на практыцы і адзін канадскі фермер, які ў выніку не толькі абагнаў канкурэнтаў па ўраджайнасці, але і... абараніў дысертацыю. Пасля такіх аповедаў ніхто ў зале не адмовіўся павучыцца распісваць пісанкі.

Да стала, на якім Наталля Дубіна давала майстар-клас, скіравалі ўвагі і дарослыя, і дзеці. Ужо з гатовымі драўлянымі пісанкамі дзеці з суполкі "Сябры" пагулялі "навбіткі": гэта калі бяруць па фарбаваным яйку і б'юцца. У каго першага разбілася — той прайграў. Святочную аўру падзеі надалі ўкраінскія народныя песні: выступаў Акадэмічны ансамбль песні ды танца "Сіверскія клейноды" з абласнога філармантчнага Цэнтра фестываляў і канцэртных праграм.

**Ніна Камінская,**
сяброўка беларускай суполкі "Сябры", г. Чарнігаў

ВЕСТКІ

# Сустрэнемся летам

**Удзельніцы вядомага фальклорнага гурта "Россияночка" з Цюменьскай вобласці прыедуць у Беларусь на пачатку чэрвеня**

Газеты "СОЮЗ" і "Российская газета" надрукавалі тэкст "В гости к самоходам": пра паездку журналістаў з Беларусі ў 2013-м у вёскі Ермакі ды Асінаўка Вікулаўскага раёна Цюменьскай вобласці: там кампактна жывуць нашчадкі беларусаў-самаходаў. "Прачытала ваш тэкст, вельмі добра напісана!" — адгукнулася на публікацыю Надзея Вычужаніна, мастацкая кіраўніца гурта "Россияночка", добра вядомага ў тых месцах.

А ў рэпертуары гурта складаюць аснову песні беларусаў-самаходаў. І яго сёлета запрасілі на Тройцу — 3 чэрвеня — выступіць у аграгарадку Рагінь: на свяце вёскі. "А Рагінь — гэта Радзіма нашых продкаў! Мы вельмі рады!" — піша нам Надзея Іванаўна. Запрашэнне зрабіла вядомая фальклarystка Вольга Лабачэўская.

То сустрэнемся летам!

**Заснавальнік:** Установа Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Рэдакцыя газеты «Советская Белоруссия». Вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, Мінск

**Рэдактар** Віктар Міхайлавіч Харкоў

**Адрас рэдакцыі:** пр. Незалежнасці, 44, Мінск, 220005

**Рэгістрацыйнае пасведчанне № 61.** Выдадзена 2 сакавіка 2009 г. Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь

**Бюро па рэкламе:** Тэл. +375 17 290 60 11

**Тэлефон рэдакцыі:** +375 17 288 17 82; факс: +375 17 290 68 31

**E—mail:** golas_radzimy@tut.by

**Аб'ём выдання:** 1 друк. арк.

**Тыраж:** 1935, **Заказ:** 533

**Час падпісання ў друк:** 20.10

Выходзіць 1 раз на тыдзень

Газета надрукавана на Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/106 ад 30.04.2004. Праспект Незалежнасці, 79, 220013, Мінск

Пазіцыі рэдакцыі і аўтараў, матэрыялы якіх друкуюцца на старонках "Голасу Радзімы", могуць не супадаць.

© "Голас Радзімы", 2017